За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 3 (74) Сакавік 2013 г.

За запрашэньне на Дзень Волі — арышт 5 сутак



Затрыманых 22 сакавіка актывістаў партыі БНФ Кастуся Смолікава і Леаніда Аўтухова ў Дзень Волі асудзілі да 5 сутак арышту. Суд цягнуўся з 11-й гадзіны да 20:45. Кастуся Смолікава і Леаніда Аўтухова, якія знаходзіліся ў ізалятары часовага ўтрыманьня, каля 11 гадзіны прывезьлі ў Кастрычніцкі райсуд. У будынку суду сабралася дзясятка паўтара віцебскіх актывістаў і ня менш — міліцыянтаў на чале з начальнікам раённай міліцыі грамадзкай бясьпекі **Андрэем Івановым**.

На пачатку паседжаньня ў залю яшчэ пускалі ўсіх ахвотных, але ад першай жа хвіліны пачаліся і выдаленьні: судзьдзя **Іна Грабоўская** загадала выйсьці актывісту **Пятру Іванову**, які гучна павіншаваў яе з Днём Волі. Судзьдзя запатрабавала таксама, каб залю пакінуў чалавек, які здымае падсудных і прысутных у залі. Але высьветлілася, што гэта быў міліцэйскі апэратар, і судзьдзя тут жа выправілася — чалавеку ў цывільным і з відэакамэрай было дазволена застацца. **Леанід Гаравы**, актывіст руху «За свабоду», напісаў з гэтай нагоды скаргу старшыні суду.

Кастусь Смолікаў на пачатку паседжаньня перадаў судзьдзі скаргу пра тое, што ён знаходзіўся пад вартай да суду больш за 48 гадзін. Гэта парушэньне адміністрацыйна-працэсуальнага заканадаўства, дапушчанае супрацоўнікамі Кастрычніцкага РАУС: затрымаўшы актывістаў 22 сакавіка а 13:40, яны мусілі б у той самы дзень перадаць іх справы ў суд.

Старшыня абласной арганізацыі партыі БНФ **Леанід Аўтухоў** запатрабаваў перакладчыка з расейскай на беларускую мову. Гэтая просьба была прадугледжаная: у залі ўжо знаходзіўся перакладчык, настаўнік сярэдняй школы № 10 **Юры Самсонаў**. Спадар Аўтухоў таксама запатрабаваў часу на знаёмства з дакумэнтамі судовай справы. Быў абвешчаны перапынак на паўгадзіны. А потым — яшчэ на дзьве гадзіны, бо Аўтухоў выступіў з хадайніцтвам, каб наняць адваката.

Звычайна суд дае на гэта некалькі дзён — з улікам таго, што вольных адвакатаў можа і ня быць, тым больш калі вядзецца пра запрашэньне канкрэтнага адваката. Але Іна Грабоўская заявіла, што абвяшчае перапынак толькі да 15 гадзіны. За гэты час Леанід Аўтухоў, жыхар райцэнтру Гарадок, мусіць недзе пазычыць грошы, знайсьці ў Віцебску адвакацкую кантору і заключыць дамову з абаронцам.

Кастуся Смолікава і Леаніда Аўтухова асудзілі паводле артыкулу 23.34 адміністрацыйнага заканадаўства — за парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавай акцыі. Затрымалі іх у памяшканьні гандлёвага цэнтру «Эвіком», дзе яны раздавалі запрашэньні на мітынг, заплянаваны на вечар 25 сакавіка ў Парку культуры і адпачынку чыгуначнікаў. Заяўку ў Чыгуначную раённую адміністрацыю падаваў спадар Аўтухоў, і ў дзень затрыманьня ён яшчэ ня меў адказу ад уладаў, хоць спавясьціць яго яны мусілі за 5 дзён да меркаванага мерапрыемства.

Выкананьня рашэньня КПЧ ААН жыхарка Віцебску дамагаецца праз суд

Як паведамлялася раней, Камітэт па правох чалавека ААН прызнаў, што ўлады Беларусі парушылі грамадзянскія і палітычныя правы **Антаніны Піванос**. Аднак улады не сьпяшаюцца выконваць рашэньне аўтарытэтнага міжнароднага органу. Каб усё-такі дамагчыся рэалізацыі гэтага рашэньня на практыцы, віцебская актывістка вымушаная была зьвярнуцца ў суд.




Антаніна Піванос накіравала пазоў у суд Чыгуначнага раёну Віцебску з патрабаваньнем выканаць рашэньне Камітэту па правах чалавека. У прыватнасьці, яна просіць спагнаць з адказчыка грашовую кампэнсацыю канфіскаванага ў яе габэлена, а таксама вярнуць суму сплачанага ёю штрафу, які быў прызначаны незаконна. Адказчыкам зьяўляецца галоўнае ўпраўленьне Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласьці.

Паводле слоў спадарыні Антаніны, габэлен са словамі малітвы «Ойча наш» яна ўласнаручна вышывала ледзьве ня год. На Дзень Волі 2008 году меркавала падарыць яго вядомаму апазыцыянэру Барысу Хамайду. Але падчас уручэньня падарунку ля «Сіняга дому» ў цэнтры Віцебску была схопленая міліцыянтамі. Падарунак канфіскавалі, на кабету склалі пратакол, пазьней судзілі і далі штраф нібыта за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце...

Згодна з рашэньнем КПЧ ААН, супрацоўнікі праваахоўных органаў і суд тады парушылі правы актывісткі, гарантаваныя Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Цяпер улады, згодна з рашэньнем, мусяць вярнуць актывістцы канфіскаваную ў яе маёмасьць, пакрыць панесеныя ёй выдаткі і выплаціць кампэнсацыю.

На жаль, ужо сталася звычайнай практыкай, што ўлады Беларусі папросту не зважаюць на меркаваньні КПЧ ААН і не выконваюць патрабаваньняў, накладзеных на іх у адпаведнасьці з рашэньнямі камітэту. Антаніна Піванос, бадай, першая на Віцебшчыне, хто спрабуе дамагчыся выкананьня гэткага рашэньня праз суд.

Кіраўніка пяршоўкі Свабоднага прафсаюзу не пусьцілі на тэрыторыю прадпрыемства



Супрацоўнікі аховы Лукомальскай ДРЭС 5 сакавіка не пусьцілі старшыню пяршоўкі Свабоднага прафсаюзу Беларускага (СПБ) Аляксея Габрыэля на тэрыторыю прадпрыемства. На думку прафсаюзнага лідэра, адміністрацыя спалохалася яго выступу на канфэрэнцыі працоўнага калектыву. Канфэрэнцыя працоўнага калектыву работнікаў Лукомальскай ДРЭС была прысьвечаная падвядзеньню вынікаў выкананьня мінулай калектыўнай дамовы і абмеркаваньню новай.

"Адміністрацыя баялася, што я выступлю з прапановай падняць зарплату, - кажа Аляксей Габрыэль. - Галоўная праблема на нашым прадпрыемстве - недастатковы рост заработнай платы. Яго зьядае інфляцыя. Энэргетыка - базавая галіна эканомікі - сядзіць на галоднай пайцы. Напэўна, урад лічыць, што ў нас усё добра. Але спыніць ад'езд энэргетыкаў у Расею можна толькі выраўноўваньнем памеру заробкаў. Цяпер беларускія энэргетыкі атрымліваюць крыху больш за пяцьсот даляраў. А ў выступе прэзыдэнта прагучала лічба 1200. Мабыць, міністэрства энэргетыкі адрапартавала наверх пра «вялікія» дасягненьні?"

Прафсаюзны лідэр лічыць, што адміністрацыя наўмысна імкнецца абмежаваць дзейнасьць Свабоднага прафсаюзу, баючыся, што працаўнікі адгукнуцца на заклікі СПБ і таксама запатрабуюць падвышэньня зарплаты.

Гарадоцкі актывіст рыхтуе скаргу на міліцыянтаў

Сябар Беларускай асацыяцыі журналістаў з Гарадка **Леанід Гаравы** прыяжджаў 25 сакавіка на суд да віцебскіх актывістаў Леаніда Аўтухова і Кастуся Смолікава. Супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС забаранілі спадару Гаравому рабіць фотаздымкі.




"Я хацеў зрабіць некалькі кадраў да пачатку судовага працэсу, бо ведаю, што падчас суду гэтага рабіць нельга. На дазвол судзьдзі спадзявацца не выпадала, але я не чакаў, што да мяне кінецца супрацоўнік Кастрычніцкага РАУС Віцебску, які назваўся Міхаілам Мядзьведзевым. Ён абурыўся, што я нібыта фатаграфую яго, потым заявіў, што ў будынку суду наогул здымаць забаронена. (Дзіўна, што гэта казаў міліцыянт, а не работнікі суду). Увогуле ж ніякіх папярэджаньняў пра забарону нідзе бачна не было", — распавёў Леанід Гаравы. Ён патлумачыў супрацоўніку, што зьяўляецца сябрам ГА "БАЖ". Але міліцыянт сказаў, што "ў сапраўднага журналіста мусіць быць бэйджык", а інакш і размаўляць няма пра што.

Леанід Гаравы адзначыў і яшчэ адну акалічнасьць: калі судзьдзя Кастрычніцкага райсуду Віцебску Іна Грабоўская папярэдзіла, што ў залі нельга праводзіць фота- і відэаздымкі, усе паслухмяна схавалі свае фотаапараты і камэры. Апрача прадстаўніка МУС у цывільным, які працягваў рабіць відэаздымкі. Судзьдзя ня ведала, хто гэты чалавек, таму загадала яму як парушальніку пакінуць залю суду. Міліцыянт падаўся да выхаду, але яго калегі патлумачылі судзьдзі, што гэта "іхны чалавек". І відэаапэратар застаўся ў залі, ды яшчэ пэрыядычна здымаў тое, што лічыў патрэбным.

Спадар Гаравы напісаў скаргу на адрас старшыні суду, бо дзеяньні судзьдзі Грабоўскай, якая не пярэчыла здымкам міліцыянта і забараніла гэта рабіць іншым, ён расцаніў як праявы дыскрымінацыі паводле прафэсійнай прыкметы.

Віцебскія ўлады не далі дазволу на вулічнае шэсьце 10 сакавіка



Віцебскі гарвыканкам адмовіў актывісту КХП-БНФ ***Яну Дзяржаўцаву*** *ў дазволе на правядзеньне вулічнага шэсьця, прымеркаванага да 150-х угодкаў паўстаньня Кастуся Каліноўскага. Прычына забароны акцыі стандартная: адсутнасьць дамоваў, прадугледжаных рашэньнем гарвыканкаму № 881 «Аб масавых мерапрыемствах у горадзе Віцебску».*

Паколькі кіраўніцтва Віцебскай гарадзкой цэнтральнай палікінікі і УУС Віцаблвыканкаму ухілілася ад заключэньня неабходных дамоваў, Ян Дзяржаўцаў разам з заявай на правядзеньне шэсьця падаваў скаргу на дзеяньні службовых асоб, у якой прасіў прымусіць апошніх заключыць дамовы. Бо, на думку Яна Дзяржаўцава, калі грамадзяне, што хочуць правесьці масавае мерапрыемства, маюць абавязак заключаць дамовы з арганізацыямі, пералічанымі ў рашэньні аблвыканкаму, дык тады такі самы абавязак маюць і самі гэтыя арганізацыі.

Аднак намесьнік старшыні гарвыканкаму **Уладзімер Шлома**, чый подпіс стаіць пад адказам на скаргу і заяву аб правядзеньні шэсьця, лічыць інакш. Грамадзяне і юрыдычныя асобы свабодныя ў заключэньні дамоваў, прымус да заключэньня дамоваў не дапускаецца, за выключэньнем выпадкаў, калі абавязак заключыць дамову прадугледжаны заканадаўствам або добраахвотна прынятым абавязальніцтвам, — напісаў ён актывісту КХП-БНФ. Чаму рашэньне гарвыканкаму № 881 зьяўляецца заканадаўчым актам, абавязковым для выкананьня грамадзянамі, і пры гэтым ні да чаго не абавязвае арганізацыі, пазначаныя ў гэтым рашэньні, спадар Шлома не патлумачыў. Як не патлумачыў і тое, якім чынам на практыцы можна выканаць рашэньне гарвыканкаму.

«Улады сваёй адмовай у правядзеньні шэсьця ў гонар 150-годзьдзя нацыянальна-вызваленчага паўстаньня супраць Расейскай імпэрыі пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага паказалі, што яны падтрымліваюць зьнішчэньне Расеяй нашай былой краіны – Вялікага Княства Літоўскага. Лічу, што цяперашнія ўлады падтрымліваюць намаганьні Расеі па зьнішчэньні сапраўднай беларускай гісторыі, беларускай мовы і культуры ды, у рэшце рэшт, і самой краіны пад назвай Беларусь», — сказаў Ян Дзяржаўцаў.

Беларуская Фэміда: Для жыхароў Віцебску права на мірныя сходы больш не існуе

Віцебскія актывісты ўжо каторы раз спрабавалі выканаць рашэньне гарвыканкаму "Аб правядзеньні масавых мерапрыемствах у г. Віцебску". Згодна зь ім, заяўнікі масавых акцыяў мусяць заключыць дамовы на абслугоўваньне з ЖКГ, палікінікай і міліцыяй. Але гэтыя структуры адмаўляюцца супрацоўнічаць з апазыцыянэрамі, і Кастрычніцкі райсуд пацьвердзіў: рашэньне гарвыканкаму дазваляе дзяржаўным структурам ухіляцца ад дамоваў.

Судзьдзя Кастрычніцкага райсуду Ігар Рымша вырашыў пакінуць без задавальненьня скаргу Хрыстафора Жаляпава, кіраўніка абласной структуры руху "За Свабоду" – той зьвярнуўся ў суд, каб змусіць цэнтральную гарадзкую паліклініку заключыць дамовы на абслугоўваньне мітынгу 25 сакавіка. Галоўурач мэдычнай установы спаслаўся на загружанасьць урачоў "падчас піку сэзонных захворваньняў", і адмовіў заяўнікам мітынгу. Гэта і стала прычынай звароту ў суд. Працэс паводле скаргі Хрыстафора Жаляпава ішоў два дні, і 15 сакавіка было агучанае рашэньне. Актывістам было заяўлена, што нязгода заключыць зь імі дамову на абслугоўваньне — гэта права адміністрацыі дзяржаўных установаў.


"А як нашы правы, гарантаваныя артыкулам 35 Канстытуцыі? Пра тое, што грамадзяне маюць права на правядзеньне масавых акцыяў? Атрымліваецца, што гарвыканкам патрабуе ад нас дамоваў, заяўнікі масавых імпрэзаў мусяць іх падаць, але дзяржаўных установаў рашэньне ўладаў нібыта і ня тычыцца. Мы - абавязаныя, а яны — не. Суд вырашыў, што ад іх нельга патрабаваць выкананьня рашэньня гарвыканкаму, бо там не напісана "установы абавязаныя..." Значыць, гэтае рашэньне складзена такім чынам, што парушаюцца нашыя правы", — кажа Хрыстафор Жаляпаў.

Аляксей Гаўруцікаў, другі заяўнік мітынгу, замоўленага на 25 сакавіка ў Парку 30-годзьдзя ВЛКСМ, называе судовае рашэньне "падарункам" да Дня Канстытуцыі: "**Якраз 15 сакавіка, у Дзень Канстытуцыі, суд агучыў рашэньне, згодна зь якім нашыя правы парушаюцца на законнай падставе. Рашэньне гарвыканкаму №881 "Аб правядзеньні масавых акцыяў у г. Віцебску" абмяжоўвае нашы правы, бо яго немагчыма выканаць.** Ужо тры гады мы спрабуем атрымаць дазвол на акцыі, але нам яго не даюць, бо мы ня можам дамовіцца то зь міліцыяй, то з мэдыкамі. Нам адмаўляюць з самых розных, часам сьмешных прычын, а цяпер яшчэ і суд заявіў, што адмаўляць нам могуць бясконца... Што застаецца? Будзем зьбіраць дакумэнты, каб змусіць гарвыканкам унесьці зьмены ва ўласнае рашэньне".

Спробы патрабаваць зьмен у рашэньне № 881 ужо рабіліся. Але з гарвыканкаму прыходзілі адказы, што гэты дакумэнт прайшоў юрыдычную экспэртызу і ўнесены ў рэестар дзяржаўных актаў, — значыць, ён складзены бездакорна. Цяпер актывісты хочуць сабраць дакумэнты, якія сьведчаць пра парушэньне іх правоў, і накіраваць іх у Камітэт па правах чалавека ААН.

Віцебскія чыноўнікі ня толькі прынялі невыканальнае рашэньне. Яны самі парушылі заканадаўства аб масавых акцыях. У некаторых іншых гарадох мясцовыя ўлады спачатку вырашаюць, ці дазволіць масавае мерапрыемства, а толькі потым патрабуюць дамоваў на абслугоўваньне. А Віцебскі гарвыканкам вырашыў стварыць штучныя перашкоды, каб зрабіць правядзеньне масавых мерапрыемстваў немагчымым у прынцыпе.

Камітэт па правох чалавека ААН не задаволіў скаргу Сяргея Каваленкі



*Камітэт па правох чалавека ААН адмовіў сябру КХП-БНФ **Сяргею Каваленку** ў прызнаньні факту парушэньня яго правоў, прадугледжаных артыкуламі 2, 14, 19, 26 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах. Сяргей Каваленка зьвярнуўся ў КПЧ ААН пасьля таго, як Кастрычніцкі райсуд Віцебску за вывешваньне 7 студзеня 2010 году сьцягу на ёлцы ў цэнтры гораду прызнаў яго вінаватым у зьдзяйсьненьні «дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак», прадугледжаных артыкуламі 339 і 363 Крымінальнага кодэксу.*

Артыкул 14 пакту, у парушэньні якога абвінавачваў улады Беларусі Сяргей Каваленка, у прыватнасьці, абвяшчае: «Усе людзі роўныя перад судамі і трыбуналамі. Пры разглядзе любога крымінальнага абвінавачаньня супраць асобы або вызначэньні яе правоў ці абавязкаў кожны чалавек мае права на справядлівы і публічны разгляд справы кампэтэнтным, незалежным і бесстаронні судом... Пры прад'яўленьні крымінальнага абвінавачаньня кожны мае права на... выклік і допыт яго сьведкаў ад свайго імя на тых самых умовах, на якіх сьведкі выступаюць супраць яго».

Сяргей Каваленка заяўляў, што, адмовіўшы яму ў выкліку ў суд сьведкаў яго абароны, дзяржава парушыла яго правы, прадугледжаныя названым артыкулам. Аднак камітэт ААН прыйшоў да высновы, што «пададзеныя яму матэрыялы, у тым ліку запісы слуханьняў у судзе, не даюць падставаў меркаваць, што мела месца парушэньне бесстароннасьці суду ці прынцыпу роўнасьці спаборных магчымасьцяў, або справядлівасьці суду ў той ці іншай форме».

Што тычыцца артыкулаў 2, 19, 26, у парушэньні якіх Сяргей Каваленка таксама абвінавачваў беларускія ўлады, дык, на думку сябраў КПЧ ААН, інфармацыя, якую паведаміў актывіст, не зьяўляецца абгрунтаваньнем яго сьцьверджаньня аб парушэньні ягоных правоў. Так, напрыклад, камітэт не падвергнуў сумневу тое, што вывешваючы сьцяг на ёлку, Сяргей Каваленка такім чынам публічна выказваў свае палітычныя погляды, але адзначыў, што, згодна з нормамі пакту, свабода выказваць свае думкі можа мець абмежаваньні, неабходныя для забесьпячэньня грамадзкага парадку.

Паколькі Сяргей Каваленка не растлумачыў у дастатковай меры сваё сьцьверджаньне для мэтаў прымальнасьці, камітэт прыняў рашэньне прызнаць ягоны зварот у КПЧ ААН «непрымальным у адпаведнасьці з артыкулам 2 Факультатыўнага пратаколу».

Зруйнавалі хату, пакуль гаспадыня-інвалід ляжала ў шпіталі

Супрацоўнікі гарадоцкага прадпрыемства на Віцебшчыне ў рамках добраўпарадкаваньня тэрыторыяў разам зь безгаспадарнымі пабудовамі разабралі жылую хату. Жахлівы інцыдэнт адбыўся пакуль гаспадыня, інвалід 1 групы, была ў лякарні. Рабочыя самавольна дэмантавалі дах, вокны і дзьверы. Пацярпелай жанчыне шкоду не кампэнсавалі.

Пажыць у гэтай хаце яго ўладальніца так і не пасьпела. Пасьля куплі зьлегла ў шпіталь. За гэты час літаральна засталася бяз даху над галавой. Гарадоцкі Райаграпрамснаб так захапіўся ліквідацыяй безгаспадарных дамоў, што знаходзяцца на ягоным балянсе, што не заўважыў, як перайшоў на прыватную ўласнасьць.

Уладальніцы хаты не да разбору палётаў. Людміла Васільеўна - інвалід 1 групы. Пасьля інсульту не ўстае з ложку. Цяпер вымушаная здымаць кватэру. Пра тое,



што ад яе хаты засталіся толькі сьцены, даведалася ў шпіталі ад сьледчых.

Людміла Лабачэня, пацярпелая: "Гэта пайшло на фэрму. Яны думалі, гэта нічыйнае. Таму шыфэр, што яшчэ яны там пускалі на сваю фэрму. Кажа, вы зь імі дамаўляйцеся. Я як была ў такім стане, у мяне стан не палепшылася, няма каму было разьбірацца". Пазбаўленая вокнаў і дзьвярэй хата прыйшла ў яшчэ большы заняпад. Цяпер сюды не зарастае народная сьцежка. На прадпрыемстве, якое "пераблытала" старыя безгаспадарныя будынкі з прыватнымі, ужо зьмянілася кіраўніцтва. Пра тое, каб кампэнсаваць гаспадыні разабранай хаты прычыненую шкоду, тут нават ня думалі.

Васіль Гецікаў, намесьнік дырэктара ААТ "Гарадоцкі Райаграпрамснаб": "Кіраўніцтва было іншае. Іншы кіраўнік, іншы прараб. Цяпер яны ў нас не працуюць. І ніякіх тлумачэньняў няма. Хата на нашым фондзе жылой не значыцца. Усё вырашальна, калі яна да нас зьвернецца; мяркую, што дапаможам выйсьці з гэтай сытуацыі".

Расьсьледаваньне па крымінальнай справе сьледчы камітэт прыпыніў. Уладальніцы некалі прыстойнай хаты праваахоўнікі рэкамэндавалі зьвярнуцца ў суд. Абіваць парогі інстанцыяў жанчына ня можа фізычна. Праўда, надзеі не губляе, што калі-небудзь зноў узьнімецца на ногі, і ў яе доме запульсуюць малаткі. Але гэта будуць ужо рамонтныя работы.

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.